УДК 398.42 DOI 10.52928/2070-1608-2024-70-2-23-27

# МІФ ПРА ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ І АПОВЕСЦІ У.С. КАРАТКЕВІЧА «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА»

***А.М. МАТВЕЕВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***

*У артыкуле праводзіцца параўнанне распаўсюджанага ў еўрапейскім фальклоры міфа пра Дзікае паляванне з аповесцю У.С. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Вылучаюцца найбольш характэрныя рысы міфа ў еўрапейскім (у прыватнасці, нямецкім) фальклоры, такія як: склад Дзікага палявання, наяўнасць правадыра, спадарожнікаў-жывёл, месца і час з'яўлення прывідаў, наступствы сустрэчы з Дзікім паляваннем). Адзначаецца наяўнасць прывязкі міфа да каляндарнага цыкла. Прыводзяцца прыклады падобных легенд у беларускім фальклоры, робяцца дапушчэнні адносна магчымых вытокаў вобраза Дзікага палявання ў творы У.С. Караткевіча.*

***Ключавыя словы:*** *«Дзікае паляванне», нямецкі фальклор, еўрапейскі фальклор, беларускі фальклор, У.С. Караткевіч, міф, легенда.*

**Уводзіны.** «Дзікае паляванне» – адзін з найбольш вядомых і яркіх еўрапейскіх фальклорных архетыпаў, якія ўзыходзіць да старажытных вераванняў германскіх народаў. У каталогу фальклорных матываў Аарнэ-Томпсана «Дзікае паляванне» (*The Wild Hunt*) знаходзіцца пад нумарам E501 [9, с. 917]. Дадзеная назва аб'ядноўвае сукупнасць міфаў пра прывідных вершнікаў, якія ў пэўны час з'яўляліся на небе і ўспрымаліся людзьмі як мноства зданяў, прывідаў ці душ, што сыходзяць у пекла [4, с. 188]. Гэты міф шырока распаўсюджаны ў краінах Заходняй Еўропы і мае розныя лакальныя назвы: напрыклад, у Германіі – Das Wütende Heer, Wilde Jagd, Wildes Heer, Wodenjäger альбо Der Wilde Jäger, у Англіі – Herla's assembly, Gabriel's Hounds, у Францыі – Chasse sauvage, Chasse Aérienne, Chasse Fantastique, Chasse du roi Hérode ці Mesnie Hellequin, у Нарвегіі – Oskorei(d)a, Stålesferda, Lussiferda, у Швецыі і Даніі – Odens jakt альбо Odinsjægeren. Ён сустракаецца ў фальклорных легендах, сагах і паданнях, а таксама ў пісьмовых крыніцах: так, напрыклад, згадкі пра «Дзікае паляванне» можна знайсці ва «Усеагульнай хроніцы» Эккехарда з Аўры 1123 г., працах Гіёма Авернскага XIII ст., «Страсбургскай хроніцы» 1516 г., «Швабскай хроніцы» сяр. XVI ст., а таксама ў вершы Ганса Сакса XVI ст. і г.д. [12, с. 100].

Існуюць розныя тэорыі паходжання міфа пра «Дзікае паляванне». Адна з іх належыць да міфалагічнай школы. Так, згодна з гэтай тэорыяй, міф з'явіўся ў Паўночнай Еўропе падчас хрышчэння народаў і быў выкліканы нежаданнем людзей забыць старых багоў – гэта тлумачыць тое, што з часам яны трансфармаваліся і набылі жудаснае аблічча. У міфалагічным слоўніку Е.М. Мелецінскага адзначаецца, што «Карані ўяўленняў пра Дзікае Паляванне сыходзяць у кельцкую і германскую язычніцкую старажытнасць. Хутчэй за ўсё яны звязаныя з паданнямі пра войска мерцвякоў, якое імчыць па небе на чале з Одзінам» [20, с. 188]. Аднак, як лічыць даследчыца Ю. Шляконітэ, гэтую тэорыю можна абвергнуць шырокім арэалам распаўсюджання міфа [8, с. 48]. Паходжанне веры ў Дзікае паляванне таксама тлумачаць з пункту гледжання яго прыроднай сутнасці: так, само Дзікае паляванне лічыцца ўвасабленнем ветру і дажджу (асабліва ў горных ці атлантычных рэгіёнах); гукі, што яго суправаджаюць, ствараюць зграі пералётных птушак, асабліва калі з'яўленнее прывідаў прымеркавана да асенняга ці веснавога перыяду [1, с. 80]. Яшчэ адна тэорыя паходжання міфаў пра Дзікае паляванне звязана з культам мёртвых – лічылася, што ў зімовы перыяд адчыняўся тагасвет, і духі памерлых маглі наведваць дамы і блукаць па ваколіцах. З'яўленне Дзікага палявання таксама інтэрпрэтуюць як адлюстраванне рытуальных шэсцяў, якія мелі месца ў рэальнасці [8, с. 48].

Мэта даследавання – вылучыць найбольш характэрныя рысы міфа пра Дзікае паляванне ў еўрапейскім фальклоры, параўнаць яго з вобразам, створаным У.С. Караткевічам у аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха».

**Асноўная частка.** Міф пра «Дзікае паляванне» мае ў народнай творчасці розных рэгіёнаў Германіі і іншых краін Еўропы шэраг агульных рысаў. Удзельнікамі шэсця, як правіла, з'яўляюцца нябожчыкі ці міфічныя істоты (пазней, пад уплывам хрысціянства, імі таксама сталі пакараныя грэшнікі). Так, напрыклад, у Альпах гэта душы няшчасных людзей, якія загінулі пад лавінамі і не знайшлі супакаення [13, с. 170]. У Шлезвіг-Гольштэйне існуюць паданні пра паляўнічага, які разам з канём наляцеў на камень і загінуў, і з таго часу палюе ў лесе з трыма ганчакамі [6, с. 360]. У гэтым жа рэгіёне паляўнічы апісваецца як чалавек у шэрым адзенні, які трымае ў руках сваю галаву [6, с. 370]. У Паўночным Рэйне-Вестфаліі сустракаюцца легенды, у якіх паляванне складаецца з аднаго чалавека, які быў пакараны за парушэнне забароны (паляванне ў нядзелю ці падчас святаў) альбо злачынства (забойства аленя, які быў увасабленнем Хрыста) [5, с. 315]. Падобныя легенды таксама трапляюцца і ў Славеніі [3, с. 246]. У Ніжняй Саксоніі можна сустрэць сюжэт пра тое, як выдатны паляўнічы добраахвотна адмовіўся ад вечнага жыцця і папрасіў у Бога магчымасці працягваць займацца сваім рамяством пасля смерці [4, с. 277]. Часта Дзікае паляванне атрымлівае і хрысціянскае пераасэнсаванне: яго ўдзельнікамі могуць быць душы грэшнікаў, якія, узначаленыя Ірадам і Каінам, праносяцца па аблоках [13, с. 76]. Аднак Дзікае паляванне не заўжды складаецца з душ памерлых людзей. Так, напрыклад, Э. Хайдэ адзначае, што «ў многіх традыцыях зразумела, што паляванне – гэта мноства памерлых духаў. У іншых, напрыклад, у ісландскай традыцыі, імі з'яўляюцца эльфы» [1, с. 80].

Правадыром Дзікага палявання можа быць як невядомы чалавек, так і гістарычная, легендарная асоба, альбо бства [20, с. 188]. Напрыклад, у Аксітаніі кіраўніком Дзікага палявання быў сам кароль Артур [2, с. 6]. Э. Хайдэ піша пра тое, што «там, дзе ў Дзікага палявання ёсць правадыр, пад ім часам разумеюць легендарнага героя ці караля: Сігурда ў Нарвегіі, Вальдэмара Аттэрдага ў Даніі, Дытрыха Бернскага ў Германіі, Караля Артура ў Англіі і г.д.» [1, с. 80]. У Ніжняй Саксоніі ролю кіраўніка зданяў мог выконваць Водан, бог буры і мёртвых, які ў гэтым рэгіёне меў імя Хакельберг [13, с. 154]. Таксама правадыром палявання магла быць і жанчына – Перхта ці Фрау Холле ў некаторых рэгіёнах Германіі [1, с. 78], альбо – Гура Рыссерова ў Нарвегіі [1, с. 77]. Магло здарацца і такое, што ў палявання зусім не было кіраўніка, як, напрыклад, у паўночных рэгіёнах Германіі [1, с. 78].

Дзікае паляванне суправаджалі жывёлы, часцей за ўсё, коні і сабакі. Так, у Ірландыі поруч з паляваннем беглі пякельныя гончыя, у Паўночнай Англіі – гончыя Габрыеля, у кельтаў – сабакі Аннуна [8, с. 46]. У Даніі, паўднёвай Швецыі [1, с. 77] і Славеніі паляванне таксама суправаджалі сабакі і коні [3, с. 56]. У паданнях Шлезвіг-Гольштэйна ўзгадваліся тры сабакі, якія мелі вогненныя вочы і языкі [6, с. 360]. У гэтым жа рэгіёне распавядалі пра белага трохногага каня, які бег хутчэй за вецер [6, с. 360]. Е.Ю. Зубарава адзначае, што «правадыр “Дзікага палявання” нярэдка прымаў аблічча каня ці вершніка, які скача на чарадзейным кані» [12, с. 109]. У Дзікага палявання былі, аднак, і больш незвычайныя суправаджальнікі: напрыклад, у Нарвегіі козы ці казляняты маглі ісці разам з прывідамі ў якасці верхавых ці цяглавых жывёл [1, с. 77].

Улюбёным месцам Дзікага палявання з’яўляецца лес [7, с. 11]. Акрамя гэтага, яно магло ўзнікаць у закінутых, бязлюдных месцах – руінах замкаў ці іх ваколіцах, пра што сведчаць паданні Шлезвіг-Гольштэйна [6, с. 360] і Швабіі [12, с. 106]. У Баварыі верылі, што паляванне выходзіць з гары [12, с. 106]. Але, паколькі здані здольныя вандраваць паміж мірамі, яны маглі таксама ўзнікаць і ў нябеснай прасторы: падобныя ўяўленні існавалі ў Аксітаніі [2, с. 6], Нарвегіі [1, с. 77], Даніі і Паўднёвай Швецыі [1, с. 77], Славеніі [3, с. 64].

З’яўленне Дзікага палявання звычайна мае пэўную прывязку да пары года: часцей за ўсё, прывідныя вершнікі прыходзяць у перыяд паміж Раством і Святам трох цароў (у час паміж зімовымі святамі, які ў германскай традыцыі называўся Zwölten), а таксама ўвосень і ўвесну [8, с. 47]. Звычайна здані прыходзілі ў начны час – пра гэта сведчаць паданні, зафіксаваныя ў Шлезвіг-Гольштэйне [6, с. 365], Брандэнбургу [4, с. 58], Швабіі [12, с. 105] і Баварыі [12, с. 106]. У паданнях Нарвегіі [1, с. 77], Даніі і паўночнай Швецыі [1, с. 77] адзначаецца, што прывіды ўзнікалі падчас буры ці навальніцы.

У Скандынавіі і Германіі існавалі павер’і і абрады, звязаныя з Дзікім паляваннем, якія сведчаць пра сувязь міфа з земляробчым каляндарным цыклам. Нягледзячы на тое, што Дзікае паляванне магло быць небяспечным для тых, хто трапляўся на яго шляху, яго з’яўленне, як лічылі людзі, было звязана з пладнасцю палёў [14, с. 159]. Так, напрыклад, у Паўднёвай Скандынавіі і Паўночнай Германіі апошні сноп пакідалі каням Одзіна, а хлеб, піва, ці заколатую жывёлу маглі выносіць сабакам Дзікага палявання – усё гэта павінна было спрыяць добраму ўраджаю і жывёлагадоўлі [1, с. 80]. Таксама існавалі рытуалы, якія дапамагалі людзям засцерагчы сябе ад небяспекі. На працягу зімовых святаў, менавіта ў той час, калі з’яўлялася паляванне, дом, ежу, жывёл і свіраны крапілі святой вадой і акурвалі ядлоўцам. У Нідэрландах і Бельгіі існавала традыцыя трубіць уначы ў спецыяльны калядны рог, які вырабляўся з альховага дрэва ці метала [13, с. 170].

Неад’емнай часткай Дзікага палявання з’яўляюцца гукі і агні. Так, пры з’яўленні прывідных вершнікаў можна пачуць гучныя галасы, брахання сабак, лязгат зброі. Але ў некаторых рэгіёнах Германіі (напрыклад, у Баварыі і Паўночнай Германіі) яно мае вельмі незвычайнае гукавае суправаджэнне: «Калі прывіды “Дзікага палявання” праносяцца над зямлёй, то гучыць пяшчотная, невымоўна прыгожая музыка» [12, с. 106]. Гэтая музыка здольная зачараваць чалавека і павесці яго ўслед за паляваннем. Е.Ю. Зубарава звяртае ўвагу на тое, што ўяўленні пра шэсце “прывіднага войска”, якое суправаджала дзівосная музыка, сустракаюцца і ў нямецкай Швейцарыі. Так, пісар магістрата горада Люцэрн Рэвант Цызат запісаў: “У месяцы студзені 1608 года ў горадзе Люцэрн і яго ваколіцах можна было сустрэць дзівосны і жахлівы прывід. І пры з’яўленні гэтага прывіда ў глухую поўнач можна было чуць самую цудоўную музыку, быццам бы самі сабой гралі арфы, лютні, скрыпкі, віолы, цытры і падобныя музычныя інструменты” [12, с. 107]. Іншай важнай асаблівасцю Дзікага палявання, якая падкрэслівае яго тагасветнасць, з’яўляецца таямнічае ззянне, якое акаляе вершнікаў. Пра яго, напрыклад, узгадваюць у паданнях з Швабіі [12, с. 100] і Баварыі [12, с. 106].

Наступствы ад сустрэчы з Дзікім паляваннем могуць быць даволі рознымі. У Нарвегіі, Даніі і Паўднёвай Швецыі лічылі, што Дзікае Паляванне прадвяшчае смерць і няшчасныя выпадкі, можа забіраць коней і людзей, асабліва на дарогах [1, с. 77] У гэтых жа рэгіёнах, а таксама ў Паўночнай Германіі, паляванне магло ездзіць па дамах людзей, піць каляднае піва і есці святочную ежу [1, с. 78]. Аднак у Ніжняй Саксоніі, напрыклад, верылі, што ў Хакельберга, правадыра палявання, ёсць як ворагі, так і сябры – сябрам ён нешта прыносіць, у ворагаў жа адбірае [13, с. 154]. У Памераніі лічылі, што Дзікае Паляванне не ўчыняе шкоду пастушкам (ці тым, хто спакойна ідзе сваім шляхам па дарозе) – іх можа абараніць малітва ці нават проста маўчанне [7, с. 29]. Разам з гэтым было распаўсюджана павер’е, што, калі патурбаваць паляванне размовай, здані могуць адказаць неасцярожнаму чалавеку, скінуць яму конскую нагу і жудасна спалохаць [6, с. 360]. Напрыклад, падобны сюжэт сустракаецца ў Ніжняй [4, с. 277] і Сярэдняй Саксоніі [4, с. 58]. У Брандэнбургу было зафіксавана паданне пра музыку, які апоўначы вяртаўся дадому і ў лесе пачуў дзікае паляванне. Адзін з паляўнічых наблізіўся да дрэва, за якім хаваўся музыка, і ўсадзіў у дрэва тапор. Ад гэтага ў музыкі з’явіўся вялізны горб, пазбавіцца ад якога ён змог, толькі вярнуўшыся роўна праз год да таго самага дрэва [4, с. 65].

Як ужо было адзначана вышэй, міф пра Дзікае паляванне мае германскае паходжанне і шырока распаўсюджаны ў Германіі, Англіі, Францыі і Скандынаўскіх краінах. Аднак паданні з падобнымі матывамі сустракаюцца і ў суседніх з Беларуссю краінах – у Польшы і Літве. Ю. Шляконітэ даследавала тэксты, зафіксаваныя збіральнікам казак В. Калвайцісам у XIX стагоддзі, у якіх маюцца згадкі пра Дзікае паляванне, і прыйшла да высновы, што яны змяшчаюць у сябе як рысы германскага фальклору, так і вобразы, якія могуць быць расшыфраваныя толькі ў кантэксце літоўскай народнай творчасці [8, с. 45]. У тэкстах, якія аналізуе даследчыца, паляванне апісваецца як візуальнымі, так і слухавымі сродкамі. Сярод іх – агні, галасы паляўнічых, брахання сабак, іржанне коней, свіст, стрэлы, смех, ляскання ў далоні. Паляванне з’яўляецца ўначы, у нябеснай сферы, але таксама можа і судатыкацца з зямлёй. Акрамя таго, да апісання палявання дадаецца традыцыйнае вераванне літоўцаў пра тое, што коні маюць здольнасць бачыць формы трансцыдэнтнага свету, адчуваць прывідаў і прадчуваць смерць.

В. Шведа апісваў паданні пра Дзікае паляванне, якія былі зафіксаваны ў Познані [7, с. 27]. У іх важную ролю адыгрывае водная прастора, а таксама скрыжаванні і лясы, звычайны ж час з’яўлення зданяў – ноч. Распаўсюджаным з’яўляецца матыў вершнікаў без галавы. Акрамя таго, прывідаў акаляе агонь: «Як сабакі і коні, сам вершнік таксама выпраменьвае агонь з вачэй, рота, носа і вушэй. Ён нясе ў сабе полымя і аколены ім» [7, с. 27]. В. Шведа адзначае, што матыў вогненнага дыхання часта падкрэсліваецца ў аналагічных польскіх сагах і вар’іруецца ў розных варыянтах» [7, с. 27]. Спадарожнікі палявання – сабакі і коні чорнага ці белага колеру.

У Беларусі таксама існуюць паданні, якія некаторымі сваімі элементамі могуць нагадваць старажытны германскі міф. Так, у вёсцы Навасёлкі Слонімскага р-на было зафіксавана наступнае паданне: «Паміж вёскамі Навасёлкі і Мілошавічы ёсць хвойнік. Называюць яго Баяры. Расказваюць, што жылі ў гэтай мясцовасці багатыя баяры. Памёршых баяр хавалі ў гэтым хвойніку. На магілах баяр ставілі вялікія высечаныя камяні. Яны і зараз ёсць у гэтым лесе, толькі абраслі мохам. Кажуць, што баяры адзін раз у год выходзяць з таго свету. Тады падымаецца ў лесе страшная бура, вецер ломіць дрэвы. Каго ў гэты дзень яны застаюць на сваіх магілах – разрываюць на кускі. Гавораць яшчэ, што гэтыя баяры спяваюць з ваўкамі песні і да самай раніцы кладуць агонь» [18, с. 323]. Як і ў германскіх міфах, зданямі тут з’яўляюцца прадстаўнікі ваеннага саслоўя, яны прыходзяць у гэты свет адзін раз у год, іх з’яўленне суправаджаецца незвычайнымі з’явамі прыроды і небяспекай для людзей.

Акрамя таго, у некаторых легендах пра схаваныя скарбы сустракаюцца згадкі пра прывідную постаць каня альбо вершніка: «…тут час ад часу старажылы бачаць блакітнага каня, які гарцуе і пры прыбліжэнні да яго ўцякае і правальваецца ў зямлю» [18, с. 413]. «Не раз людзі нібы бачылі на Галубцы сівага старца на белым кані. Ён з’яўляўся на яго вяршыні і знікаў, як толькі набліжаліся да яго людзі. То з’яўлялася пара вялізных дзіўных коней. Верылі, што гэта яны вартуюць схаваныя ў магіле скарбы» [18, с. 413].

Паданні пра прывіднае паляванне ўзгадваюцца ў франтавой хроніцы ваеннага ўрача і пісьменніка Л.Н. Вайталоўскага [11, с. 288]. У сваёй кнізе аўтар прыводзіць апісанне размовы з Матвеем Бандарчуком, мясцовым старажылам, падчас іх знаходжання ў самым сэрцы Палесся. Стары чалавек распавядае старажытныя легенды, у тым ліку пра душы праведных паляўнічых і «панскае паляванне». Згодна з першым паданнем, вечнае паляванне ўспрымалася як узнагарода за праведныя паводзіны. «Праведны паляўнічы – гэта той, хто ніколі не забіваў цецеруковую самку на яйках, не знішчаў зайчыху з зайчанятамі ў чэраве, не краў яйкі з гнязда, хто не застрэліў за ўсё жыццё ніводнага галуба і забіў шмат чаек» [11, с. 288]. Такі чалавек пасля смерці мог вечна атрымліваць асалоду ад паспяховага палявання на берагах крывавай ракі, у якую сцякалася кроў з жыл забітых звяроў і птушак. Забойства чаек лічылася добрым учынкам – людзі верылі, што гэтыя птушкі маюць сувязь з д’яблам, бо ўзімку яны не злятаюць у вырай, а правальваюцца праз балота ў пякельны змрок. Згодна з паданнем, сам д’ябал перыядычна выходзіў на паверхню зямлі – кожны год за тры дні да Пятра і Паўла ён падымаўся з пекла і спраўляў на балотах вяселле. Калі чалавек станавіўся сведкам гэтай падзеі, ён да канца жыцця не мог пазбавіцца ад ліхаманкавай дрыготкі і страшных зданяў [11, с. 291].

Асаблівай увагі заслугоўвае іншае паданне з кнігі Л.Н. Вайталоўскага, якое мае назву «Панскае паляванне». «Панскім паляваннем» людзі называлі дыван з кветак, якія раслі на балоце паміж двума вялізнымі камянямі. Камні маюць назвы «Маўчы» і «Устань». Аднойчы адзін багаты пан зладзіў пір, на якім сабралася шмат іншых паноў з жонкамі, дзецьмі, чэлядзю. Пасля гуляння яны вырашылі зладзіць паляванне. Па дарозе паляванню патрапіўся стары чалавек, які пакланіўся і папярэдзіў паноў, што зараз не час для палявання. Паны пачалі сварыцца і смяяцца са старога. Раптам пачуўся гук пахавальных званоў і гул з-пад зямлі. Над каменем «Маўчы» з’явілася цёмная постаць, прагучаў грозны голас, які загадаў маўчаць. Зямля расчынілася пад панамі і паглынула іх. Пасля на гэтым месцы з’явілася багна, пакрытая кветкамі. Паданне завяршаецца словамі пра тое, што заклятце калісьці знікне: з каменя «Устань» пачуецца голас, кветкі зноўку пераўтворацца ў людзей, але яны будуць ужо зусім іншымі.

Старажытны міф пра Дзікае паляванне, безумоўна, прысутнічае і ў беларускай літаратуры – да вобраза Дзікага палявання звяртаўся вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч у аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» [14]. У паданні, якое чуе галоўны герой твора, удзельнікамі Дзікага палявання з’яўляюцца Кароль Стах і яго паляўнічы атрад, якія былі забітыя ў выніку здрады пабраціма караля – Рамана Яноўскага. Стах аддаў душу д’яблу і паабяцаў пераследваць здраднікаў да дванаццатага калена. У вобразе здані ён носіць капялюх з заломленым полем, які насунуты на яго вочы, а ногі яго прывязаныя да сядла. У аповесці гаворыцца аб тым, што паляванне з’яўляецца ў прызначаны час: «была восень, час, калі паляванне караля Стаха з’яўляецца асабліва

часта» [15, с. 42]; «нават калі яны з'яўляюцца часта, яны не прыходзяць у ночы на святыя дні, а таксама ў сераду і пятніцу. <…> На нядзелю Бог даў ім дазвол, бо, як памятаеце, Стах быў забіты таксама ў нядзелю» [15, с. 44]. Месца з'яўлення палявання – лес, дрыгва. Асаблівую цікаўнасць выклікае яго акустычная характарыстыка: «Не бразгалі цуглі, не звінелі мячы. На конях сядзелі маўклівыя коннікі» [15, с. 40]. «І раптам забегалі недзе ззаду сінія балотныя агні, і даляцеў з таго боку спеў рагоў і ледзь чутны стук капытоў. А пасля з'явіліся цьмяныя цені коннікаў. Грывы коней веялі па ветры, беглі перад дзікім паляваннем гепарды, спушчаныя са шворак. І бязгучна па верасе і дрыгве ляцелі яны. І маўчалі коннікі, а гукі палявання далятаталі аднекуль з другога боку. І перад усімі скакаў, асветлены месяцам, туманны і вялізны кароль Стах. І гарэлі вочы коней, і людзей, і гепардаў» [15, с. 40]. Дадзенае апісанне таксама дае інфармацыю пра наяўнасць тагасветнага ззяння, што сыходзіць ад палявання, і пра яго спадарожнікаў – гепардаў. Такім чынам, можна пабачыць, што шмат элементаў сугучныя з германскімі міфамі, якія былі разгледжаны вышэй (час з'яўлення, гукі, містычнае ззянне, удзельнікі і правадыр, таксама назва «Дзікае паляванне» мае адпаведнік менавіта ў нямецкім варыянце міфа «Wilde Jagd»), але таксама мае свае арыгінальныя дэталі (матывацыя – помста за здраду, спадарожнікі – гепарды).

Можна дапусціць, што Уладзімір Караткевіч натхніўся германскім міфам падчас свайго навучання на філалагічным факультэце Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т.Р. Шаўчэнкі. Вядома, што першы варыянт аповесці пісьменнік стварыў пасля першага курса, летам 1950 года. Па ўспамінах самога пісьменніка, ён вельмі шмат часу праводзіў у бібліятэцы: «Там [у Кіеўскім універсітэце] былі лепей упарадкаваныя бібліятэкі (асабліва аддзелы рэдкіх кніг і рукапісаў) і архівы… Кнігі, залашчаныя сотнямі рук, і кнігі (часта не менш цікавыя), якія за сто год не разрэзала нічыя рука, і тады ты першаадкрывальнік. І – некалькі разоў – ледзь не выключэнне з універсітэта за тое, што я не хаджу на многія лекцыі, а замест гэтага прападаю ў бібліятэцы» [16, с. 110]. Акрамя таго, па ўспамінах сяброў і знаёмых вядома, што Уладзімір Сямёнавіч выдатна ведаў нямецкую мову і быў добра знаёмы з нямецкай літаратурай: «Ён добра ведаў нямецкую і лацінскую мовы, выкарыстоўваў у "Каласах..." французскія дыялогі» [19, с. 37]; «У той вечар Валодзя таксама прачытаў верш з рэфрэнам "Лиофеля, дочь короля", навеяны нейкай нямецкай легендай» [16]; «Уласны пераклад вершаванага тэксту з паэмы "Германія. Зімовая казка" нямецкага паэта Генрыха Гейнэ падаў у п'есе "Млын на Сініх Вірах", якую закончыў 11 красавіка 1957 г.» [10, с. 89].

Да таго ж вядома, што пісьменнік шчыра цікавіўся беларускім фальклорам і прымаў удзел у этнаграфічных экспедыцыях: «22–31 (?) ліпеня 1971 г. у складзе экспедыцыі "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" Інстытута мастацтвазнаўсвта, этнаграфіі і фальклору АН БССР даследваў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны Віцебскай вобласці» [10, с. 226]. Аднак наяўнасць вялікай колькасці падабенстваў у апісанні Дзікага палявання ў яго аповесці і ў нямецкім фальклоры, хутчэй, сведчыць пра тое, што пісьменнік натхняўся менавіта нямецкім міфам пра містычнае начное шэсце прывідных вершнікаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, міф пра Дзікае паляванне, шырока распаўсюджаны ў еўрапейскім фальклоры, мае германскае паходжанне. Як правіла, Дзікае паляванне складаецца з душ памерлых людзей. Яго ўзначальвае легендарная ці гістарычная асоба, суправаджаюць жывёлы (часцей за ўсё, коні і сабакі). Дзікае паляванне з'яўляецца ў бязлюдных месцах (такіх як лес, руіны, горы) у пэўны перыяд (паміж зімовымі святамі альбо ўвосень ці ўвесну). У Германіі існавалі абрады, звязаныя са з'яўленнем Дзікага палявання, што можа сведчыць пра існаванне прывязкі міфа да земляробчага цыкла.

У беларускім фальклоры таксама можна знайсці легенды, якія перагукаюцца з характарыстыкамі Дзікага палявання ў еўрапейскім фальклоры. Аднак, прааналізаваўшы вобраз Дзікага палявання ў аповесці Уладзіміра Караткевіча, можна зрабіць выснову, што ён больш набліжаны да вобраза, характэрнага для германскага фальклора. Так, удзельнікамі палявання ў аповесці з'яўляюцца памерлыя людзі, якія не знайшлі супакаення пасля смерці і прагнуць помсты. Іх правадыром з'яўляецца гістарычная асоба – кароль Стах. У аповесці таксама прысутнічаюць жывёлы-спадарожнікі палявання. Акрамя гэтага, адзначаецца, што Дзікае паляванне караля Стаха, як і Дзікае паляванне ў германскай традыцыі, прыходзіць у пэўны час – увосень, але пры гэтым пазбягае з'яўлення ў ночы на святыя дні. Характэрнае месца з'яўлення палявання – бязлюдная дрыгва. Таксама ў творы У.С. Караткевіча маюцца такія вызначальныя рысы Дзікага палявання, як тагасветныя агні і незвычайныя гукі. Усё гэта набліжае вобраз Дзікага палявання ў аповесці беларускага пісьменніка, аздоблены самабытнымі культурнымі і гістарычнымі дэталямі, да старажытнага германскага міфа.

ЛІТАРАТУРА


1. Arv-Nordic Yearbook of Folklore, Vol.75 / ed. A. B. Amundsen. – Uppsala: The Royal Gustavus Adolphus Academy, 2019. – 227 с.
2. Bach X., Bernard P. J. Le rey Artus, texte occitan du xviiie siècle // Revue des Langues Romanes. – 2020. – № 1. – P. 129–140.
3. Kropej M. Supernatural beings from slovenian myth and folktales. – Ljubljana: Scientific research centre of the slovenian academy of sciences and arts, 2012. – 284 p.
4. Kuhn A. Norddeutsche Sagen, Märchen und Gebräuche. – Leipzig: Brockhaus, 1848. – 508 p.
5. Kuhn A. Sagen, Märchen und Gebräuche aus Westfalen. – Leipzig: Brockhaus, 1859. – 627 p.
6. Müllenhof K. Sagen, Märchen und Lieder der Herzogthümer Schleswig, Holstein und Lauenburg. – Kiel: Schwerssche Buchhandlung, 1845. – 622 p.
7. Schweda V. Die Sagen vom wilden Jäger und vom schlafenden Heer in der Provinz Posen. – Gnesen: Graphische Anstalte J.B. Lange, 1915. – 107 с.

8. Šlekonytė J. Lietuvininkų sakmės apie "laukinę medžioklę": vaizdinio kilmės klausimu // Tautosakos darbai. – 2014. – № 47. – P. 43–68.
9. Thompson S. Motif-index of folk-literature : a classification of narrative elements in folktales, ballads, myths, fables, mediaeval romances, exempla, fabliaux, jest-books, and local legends. – Bloomington: Indiana University Press, 1955–1958. – 2465 p.
10. Верабей А.Л. Блізкае і дарагое: выбраныя артыкулы Уладзіміра Караткевіча / навук. рэд. У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Белар. навука, 2020. – 310 с.
11. Войтоловский Л.Н. Всходил кровавый Марс: По следам войны. – М.: Воениздат, 1998. – 430 с.
12. Зубарева Е.Ю. «Неистовое войско» («Das wütende Heer») или «Дикая охота» («Die wilde Jagd») в структуре традиционных мифологических представлений германских народов // Stephanos. – 2016. – № 3(17). – С. 99–118.
13. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Зимние праздники / Редкол.: С.А. Токарев (отв.ред.) – М.: Наука, 1973. – 350 с.
14. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: летне-осенние праздники / Редкол.: С.А. Токарев (отв.ред.). – М.: Наука, 1978. – 295 с.
15. Караткевіч У.С. Дзікае паляванне караля Стаха: апошняя аповесць «Сямейных паданняў роду Яноўскіх», расказаная Андрэем Беларэцкім. – Мінск: Беларусь, 2020. – 175 с.
16. Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. – Т. 8. Кн. 2. З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці. – Мінск: Маст. літ-ра, 1991. – 493 с.
17. Крыгман Л. Баляда аб школьным сябры [Электронны рэсурс]. – URL: https://karatkevi.ch/uspamini/krygman.html. (Дата звароту: 15.09.2023).
18. Легенды і паданні / рэд. т. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
19. Мальдзіс А. Уладзімір Караткевіч – пісьменнік беларускі і еўрапейскі // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.). – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 35–39.
20. Мифологический словарь / Гл. ред. Е.М. Мелетинский. – М.: Советская Энциклопедия, 1990. – 672 с.

*Пастуніў 07.11.2023*

## МИФ О ДИКОЙ ОХОТЕ В ЕВРОПЕЙСКОМ ФОЛЬКЛОРЕ И ПОВЕСТИ В.С. КОРОТКЕВИЧА «ДИКАЯ ОХОТА КОРОЛЯ СТАХА»

***А.Н. МАТВЕЕВА***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье проводится сравнение распространенного в европейском фольклоре мифа «Дикая охота» с повестью В.С. Короткевича «Дикая охота Короля Стаха». Выделяются наиболее характерные черты мифа в европейском (и, в частности, в немецком) фольклоре, такие как: состав Дикой охоты, наличие предводителя, спутников-животных, место и время появления призраков, последствия встречи с Дикой охотой). Отмечается наличие привязки мифа к календарному циклу. Приводятся примеры схожих легенд в белорусском фольклоре, делаются предположения касательно возможного источника образа Дикой охоты в произведении В.С. Короткевича.*

***Ключевые слова:*** *«Дикая охота», немецкий фольклор, европейский фольклор, белорусский фольклор, В.С. Короткевич, миф, легенда.*

## THE MYTH OF THE WILD HUNT IN EUROPEAN FOLKLORE AND IN THE NOVEL «KING STAKH'S WILD HUNT» WRITTEN BY U. S. KARATKIEVICH

***A. MATVEYEVA***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article compares the myth of the Wild Hunt, which is widespread in European folklore, with «The Wild Hunt of King Stach» written by U. S. Karatkievich. The most characteristic features of the myth in European (and in particular in German) folklore are highlighted, such as: the participants of the Wild Hunt, their leader, accompanying animals, the place and time of the appearance of ghosts, the consequences of meeting with the Wild Hunt). The article highlights that the myth has a connection with the calendar cycle. Examples of similar legends in Belarusian folklore are given, assumptions are made as to the possible source of the Wild Hunt motif in the book written by U. S. Karatkievich*

***Keywords:*** *«Wild Hunt», German folklore, European folklore, Belarusian folklore, V. S. Korotkevich, myth, legend.*